**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

# ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СА СКАРОЧАНЫМ ТЭРМІНАМ НАВУЧАННЯ : ВЫНІКІ І ПРАБЛЕМЫ (на прыкладзе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый)

У свеце ідзе пошук новых сістэм адукацыі, больш дэмакратычных, дыверсіфікаваных і выніковых з пазіцыі інтарэсаў грамадства. Новыя патрабаванні да ўзроўню адукаванасці ўвогуле дыктуюцца мэтай выжывання чалавека як біялагічнага віду і сацыяльнага суб'екта. Імкненне пераадолець у адукацыі прафесійную замкнёнасць і культурную абмежаванасць, арыентацыя на гарманічную асобу – характэрныя прыметы нашага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Беларусі на фоне глыбокіх сацыяльных перамен з пачатку 90-х гг. XX ст. пачалося рэфармаванне сістэмы адукацыі. Яго неабходнасць выклікана, у прыватнасці, тым, што ў вышэйшай школе на шэрагу кірункаў склаўся істотны разрыў паміж глабальнымі патрэбамі грамадства і вынікамі адукацыі, паміж аб'ектыўнымі патрабаваннямі часу і агульным узроўнем адукаванасці, паміж прафесіянальнай арыентацыяй і патрэбамі асобы ў гарманічным задавальненні разнастайных пазнавальных інтарэсаў, паміж сучаснымі метадалагічнымі падыходамі да навук і архаічным стылем іх выкладання.

Новая адукацыйная парадыгма ў якасці прыярытэту вышэйшай адукацыі разглядае арыентацыю на адэкватныя сучасным тэндэнцыям грамадскага развіцця інтарэсы асобы.

Адукацыю можна лічыць накіраванай на інтарэсы развіцця асобы, калі з дапамогай адукацыі:

– гарманізуюцца адносіны чалавека з прыродай праз засваенне сучаснай навуковай карціны свету;

– стымулююцца інтэлектуальнае развіццё і ўзбагачэнне мыслення праз засваенне сучасных метадаў навуковага пазнання;

– дасягаецца паспяховая сацыялізацыя чалавека праз яго пагружэнне ў культурнае, у тым ліку тэхнагеннае і камп'ютэрызаванае, асяроддзе;

– чалавек вучыцца жыць ва ўмовах актыўнага інфармацыйнага асяроддзя, якое садзейнічае бесперапыннай самаадукацыі;

– рэалізуюцца патрэбы ў новым узроўні развіцця навукі, ствараюцца ўмовы для набыцця грунтоўнай базавай адукацыі, якая б дазваляла хутка пераключацца на сумежныя сферы прафесійнай дзейнасці.

Вырашэнне гэтых задач вымушае прынцыпова новых мэт вышэйшай адукацыі, якія заключаюцца ў дасягненні новага ўзроўню адукаванасці асобы і грамадства ўвогуле.

Адукацыя павінна быць накіравана на універсальныя веды, яна прадугледжвае фарміраванне агульнай культуры, структур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную і змястоўную перапрацоўку вучэбных курсаў, узгадненне іх зместу магчыма да стварэння цыклаў і адзінага культурна-навуковага адукацыйнага поля.

Важным звяном у вырашэнні азначаных праблем служыць арганізацыя падрыхтоўкі спецыялістаў для сістэмы бібліятэк і органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі краіны на базе сярэдняй бібліятэчнай адукацыі. Апошняе дазваляе скараціць тэрміны навучання пры адначасовым павышэнні эфектыўнасці, якасці падрыхтоўкі студэнтаў як завочнага, так і дзённага навучання і забяспечвае бесперапыннасць за кошт пераемнасці сярэдняй і вышэйшай адукацыі, удасканалення механізма іх узаемадзеяння, узмацнення інтэграцыйных працэсаў бібліятэчна-бібліяграфічнай навукі і практыкі.

З 1995 г. на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў пачалася падрыхтоўка спецыялістаў са скарочаным тэрмінам навучання на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі, накіраваная на інтэнсіфікацыю вышэйшай адукацыі. Падрыхтоўка вядзецца па спецыялізацыях "публічныя бібліятэкі" на завочнай форме навучання; "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі" на дзённай. Гэтаму папярэднічала распрацоўка спецыяльных вучэбных планаў з улікам патрабаванняў бібліятэчнай навукі і практыкі. Вучэбныя планы прадугледжваюць вывучэнне сацыяльна-гуманітарных і сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Яны садзейнічаюць засваенню ведаў па навуковым аналізе сацыяльна значных праблем і працэсаў, а таксама эстэтычных і прававых нормаў, рэгулюючых адносін чалавека да чалавека, грамадства, навакольнага асяроддзя.

Другі цыкл – цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін – мае вялікае значэнне для глыбокага авалодання сваёй прафесіяй. Тут прадугледжваюцца фундаментальная гуманітарная падрыхтоўка, атрыманне ведаў аб структуры, заканамернасцях узнікнення, развіцця і функцыянавання сістэмы сацыяльных камунікацый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дысцыпліны спецыялізацыі прадугледжваюць, што будучы работнік у межах спецыяльнасці павінен мець глыбокія веды, валодаць практычнымі навыкамі работы з дзецьмі, падлеткамі і юнакамі. Гэты цыкл дысцыплін адлюстроўвае працэс трансфармацыі атрыманых у першы год навучання фундаментальных ведаў (у выніку вывучэння агульнаадукацыйных дысцыплін) у прафесійныя.

Асаблівасцю вучэбнага плана па сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў па абслугоўванні дзяцей, падлеткаў і юнакоў з'яўляецца наяўнасць у ім шэрага дысцыплін вышэйшай навучальнай установы, якія выкладаюцца падчас навучання ў сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе. Гэта прадметы агульнаадукацыйнага, прафесійнага і спецыяльнага кірункаў. Яны даюць магчымасць студэнтам праверыць сябе на гатоўнасць навучання ў вышэйшай навучальнай установе, пераканацца ў прафесійным выбары і неабходнасці працягнуць вучобу ва універсітэце. Сувязі "тэхнікум–універсітэт" не абмяжоўваюцца толькі наборам студэнтаў.

Важным кірункам дзейнасці сістэмы "тэхнікум–універсітэт" з'яўляецца сумесная навукова-метадычная дзейнасць. Метадычная работа дазваляе павысіць кваліфікацыю выкладчыкаў тэхнікума і якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў дзіцячых і школьных бібліятэк. Практыкуюцца сумесныя навукова-метадычныя канферэнцыі, семінары-практыкумы, кансультацыі, прэзентацыі вучэбна-метадычнай літаратуры.

Назапашаны вопыт вышэйшай і сярэднай прафесійнай адукацыі дазваляе заключыць наступнае:

1. Моладзь мае магчымасць выбару для рэалізацыі сваіх здольнасцей, а таксама магчымасць атрымання кваліфікацыі на любым этапе навучання з выдачай дакумента дзяржаўнага ўзору.

2. Выкладчыкі ВНУ дапамагаюць удасканальваюць метады выкладання ў тэхнікуме (лекцыйная форма навучання, удзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце, арганізацыя самастойнай

работы), што дазваляе выпускнікам хутка адаптавацца ў вышэйшай навучальнай установе.

3. Захоўваецца пераемнасць метадаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце.

4. Усталёўваюцца пастаянныя творчыя і дзелавыя кантакты паміж тэхнікумам і ВНУ.

Адзначанае сведчыць, што шлях інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу на падставе пераемнасці сярэдняй і вышэйшай адукацыі выбраны правільна.

Параўнальны аналіз паспяховасці студэнтаў I–III курсаў паказвае, што яна вышэй (у сярэднім на 3–5%) у тых, хто мае сярэднюю бібліятэчную базавую адукацыю. Адлічэння студэнтаў з гэтай спецыялізацыі практычна няма. Студэнты хутчэй адаптуюцца ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы, актыўна вучацца, выкарыстоўваючы раней атрыманыя веды і вопыт практычнай работы.

Разам з тым вынікі падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў скарочаныя тэрміны навучання ўказваюць на наяўнасць праблем, неабходнасць карэкціроўкі далейшага ўдасканалення зместу і арганізацыі вучэбнага працэсу як у тэхнікуме, так і ВНУ.

Скарачэнне тэрміну навучання пры захаванасці ўсёй наменклатуры дысцыплін тыпавога вучэбнага плана і адначасовым памяншэнні часу аўдыторных заняткаў прыводзіць да значнай перанапружанасці студэнтаў. Відавочна, што ў далейшым неабходна звярнуць увагу на больш мэтанакіраваны адбор абавязковых курсаў з улікам пераемнасці сярэдняй і вышэйшай адукацыі, не выключаючы ўзбуйнення асобных спецыяльных дысцыплін, паглыбляючы міжпрадметныя сувязі, пашыраючы разнастайнасць формаў навучання з улікам творчых здольнасцей студэнтаў.

Вялікія магчымасці маюцца і ў адборы зместу кожнай асобнай дысцыпліны. Тут перш за ўсё маюцца на ўвазе праграмы курсаў, якія з'яўляюцца важным нарматыўным дакументам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбнага працэсу. Неабходна стварэнне больш інтэграваных вучэбных праграм, якія б паўней улічвалі змест і аб'ём дысцыплін у сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі і былі заснаваны на прынцыпах пераемнасці і сістэмнасці, разлічаных на падрыхтоўку спецыялістаў у скарочаныя тэрміны. Патрабуюць перагляду праграмы агульнанавуковага цыкла, паколькі яны ў значнай меры дубліруюць праграмы сярэдніх спецыяльных устаноў і не арыентаваныя на канчатковую мэту – падрыхтоўку спецыялістаў у сферы бібліятэчнай справы, а разлічаны на падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй увогуле.

Праграмы дысцыплін вучэбнага плана скарочанага тэрміну навучання павінны быць звязаны паміж сабой настолькі, каб стварыць адзіную сістэму інтэнсіўнай падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчнага профілю за тры гады, дзе кожная дысцыпліна была б часткай яе ўнутранай структуры, забяспечвала б пераемнасць і аптымальную паслядоўнасць вывучэння тых ці іншых дысцыплін з улікам праграмы вучэбнага працэсу ў сярэдняй спецыяльнай вучэбнай установе. Міжпрадметныя сувязі ў вучэбным працэсе, безумоўна, істотна ўплываюць на інтэнсіфікацыю падрыхтоўкі кадраў у скарочаныя тэрміны.

Скарачэнне тэрміну навучання не павінна прывесці да зніжэння ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў. У сувязі з гэтым востра паўстала праблема выкарыстання актыўных метадаў і тэхнічных сродкаў у працэсе навучання. Асаблівая ўвага надаецца самастойнай творчай рабоце студэнтаў, скарачаецца аб'ём лекцыйных, а павялічваецца колькасць семінарскіх, практычных, лабараторных заняткаў. Неабходна сур'ёзна аднесціся да таго, што ўключаць у лекцыю, асабліва для студэнтаў са скарочаным тэрмінам навучання. Лекцыя павінна стаць формай падрыхтоўкі да самастойнай работы студэнтаў і таму мець праблемны, аглядны характар.

Актыўныя метады навучання ўсё большае месца займаюць у вучэбным працэсе. На кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўжываюцца дзелавыя гульні, дыспуты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-практычныя канферэнцыі, публічныя абароны курсавых работ, выкладчыкі дысцыплін сацыяльнага кірунку выкарыстоўваюць праграміраваныя заданні і тэхнічныя сродкі навучання. Элементы рэйтынгавай сістэмы ляжаць у аснове рубежнага кантролю, самастойнай работы.

Аднак праблема інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу пакуль да канца не вырашана. Неабходны больш эфектыўныя метады рубежнага кантролю з шырокім выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, якія ствараюць значныя рэзервы вучэбнага часу, дазваляюць падтрымліваць зацікаўленасць студэнтаў у інтэнсіўнай рабоце, у павышэнні ўзроўню ведаў і ў магчымасці вызвалення ад залікаў або экзаменаў.

Умовай паспяховага выканання вучэбнага плана з'яўляюцца сістэматычная самастойная работа студэнтаў на працягу ўсяго перыяду навучання і дакладная сістэма метадычнага забеспячэння. У вучэбным плане прадстаўлены аб'ём самастойнай работы па кожнай дысцыпліне.

Важным этапам арганізацыі самастойнай работы з'яўляецца вызначэнне колькасці відаў і элементаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне з улікам плануемай паслядоўнасці правядзення розных відаў заняткаў. Галоўнае тут –метадычнае забяспячэнне. Створаны метадычныя распрацоўкі для студэнтаў па асноўных дысцыплінах вучэбнага плана, выкананні курсавых і дыпломных работ. Але метадычныя матэрыялы не заўсёды ўлічваюць спецыфіку навучання ў скарочаныя тэрміны асоб, якія маюць сярэднюю бібліятэчную адукацыю. Аналіз метадычных матэрыялаў паказвае, што яны недастаткова ўзгадняюцца з вучэбным планам, маюць вялікія спісы абавязковай літаратуры (не ўлічваюць рэальны час студэнта), у іх практычна адсутнічаюць індывідуальныя заданні. Таму важнай задачай з'яўляюцца павышэнне якасці метадычных матэрыялаў, якія б садзейнічалі інтэнсіўнай самастойнай рабоце, стварэнне сістэмы метадычнага забеспячэння. Сістэму метадычнага забяспячэння неабходна разглядаць як сродак фіксацыі і ўдасканалення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадычных канцэпцый вучэбна-выхаваўчай работы, як сродак пераўтварэння педагагічнай працы ў прадуманую і навукова абгрунтаваную тэхналогію падрыхтоўкі і павышэння прафесійнага ўзроўню бібліятэчных работнікаў.

Інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу, удасканаленне вучэбна-метадычнага матэрыялу і дакументацыі дазволяць забяспечыць эфектыўную падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у скарочаныя тэрміны навучання, арыентаваную на дасягненне перспектыўнага ўзроўню развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнай навукі і практыкі. Падчас пошукаў аптымальных рашэнняў было б вельмі своечасова пры кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы на базе спецыялізацыі "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі" (групы са скарочаным тэрмінам навучання) пачаць падрыхтоўку бібліятэкараў-сацыяльных педагогаў, маючых права працаваць дадаткова ў групах падоўжанага дня ў школах) і бібліятэкараў–настаўнікаў інфармацыйнай культуры. Гэта дазволіць узняць прэстыж прафесіі бібліятэкара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ